ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)
УДК 7/9(476)
https://doi.org/10.29235/2524-2369-2018-63-3-391-401

Паступіў у рэдакцыю 28.08.2018
Received 28.08.2018

**А. А. Каваленя, В. І. Ляўковіч, В. С. Юшкевіч**

*Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Мінск, Беларусь*

# ГУМАНІТАРНАЯ НАВУКА БЕЛАРУСІ: ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ (ДА 90-ГОДДЗЯ З ДНЯ ЗАСНАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ)

**Аннотация.** Авторы сделали небольшой экскурс в историю становления отечественной гуманитарной науки, проанализировали достижения ученых-гуманитариев последних лет. Отмечены наиболее крупные результаты и опубликованные фундаментальные труды, раскрывающие богатейший историко-культурный и духовный пласт белорусского народа и не имеющие аналогов за рубежом. Показаны место и роль социально-гуманитарных наук в белорусском обществе. Подчеркнуто, что главной задачей исследований ученых-гуманитариев является аргументированное отстаивание исторической правомерности белорусской государственности и национально-государственных интересов Республики Беларусь в мировом сообществе, сохранение духовных и материальных историко-культурных ценностей белорусского народа, укрепление международного престижа страны и белорусской гуманитарной науки. Представлены наиболее значимые практические достижения ученых-гуманитариев и количественные итоги работы за последние годы.

**Ключевые слова:** социально-гуманитарные науки, общество, государственность, духовные и материальные ценности, развитие

**Для цитирования:** Каваленя, А. А. Гуманітарная навука Беларусі: гісторыя і сучаснасць (Да 90-годдзя з дня заснавання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі) / А. А. Каваленя, В. І. Ляўковіч, В. С. Юшкевіч // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2018. – Т. 63, № 4. – С. 391–401. https://doi.org/10.29235/2524-2369-2018-63-4-391-401

**A. A. Kovalenya, V. I. Levkovich, O. S. Yuschkevich**

*National Academy of Sciences of Belarus, Minsk, Belarus*

## HUMANITARIAN SCIENCE OF BELARUS: HISTORY AND THE PRESENT (TO THE 90th ANNIVERSARY OF THE FOUNDATION OF THE NATIONAL ACADEMY OF SCIENCES OF BELARUS)

**Abstract.** The article analyzes the results and achievements of scholars-humanists in the recent years. The work denotes unparalleled and the most important fundamental studies that reveal rich historical, cultural and spiritual stratum of Belarusian people. Authors also show the place and the role of social and humanitarian sciences in Belarusian society.

The work stresses that the main objective of the research of scholars-humanists is not only the defence of the historical legitimacy of the Belarusian statehood and national-state interests of the Republic of Belarus in the world community, but also the preservation of the spiritual, material, historical and cultural values of Belarusian people and the strengthening of both: the country's international prestige and Belarusian humanitarian science.

And finally, the paper presents quantitative results of the research and the most significant practical achievements of scholars accomplished in the recent years.

**Keywords:** humanities and social sciences, society, statehood, spiritual and material values, development

**For citation:** Kovalenya A. A., Levkovich V. I., Yuschkevich O. S. Humanitarian science of Belarus: history and the present (To the 90th anniversary of the foundation of the National Academy of Sciences of Belarus). *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series*, 2018, vol. 63, no. 4, pp. 391–401 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2018-63-4-391-401

Набыццё нацыянальна-дзяржаўнага суверэнітэту, умацаванне міжнацыянальнай і міжканфесійнай згоды ў грамадстве аб'ектыўна патрабуюць узбагачэння народа неабходнымі навуковымі ведамі і разумення сутнасці грамадскага развіцця. Менавіта гуманітарныя навукі дапамагаюць людзям знайсці адказ на многія пытанні грамадскага жыцця, дазваляюць пазбегнуць духоўнай разрухі, каб не здрадзіць нацыянальным традыцыям, не аказацца заложнікамі модных тэндэнцый і не стаць прыхільнікамі чужых ідэйных плыняў і памкненняў.

© Каваленя А. А., Ляўковіч В. І., Юшкевіч В. С., 2018

Сёння адбываецца мэтанакіраваны перагляд гістарычнага мінулага народаў. Фальсіфікацыя гісторыі – гэта кагнітыўная зброя, імкненне ўкараніць у інтэлектуальнае асяроддзе лжывыя парадыгмы, канцэпцыі, стратэгіі і навуковыя тэорыі, якія потым будуць успрыняты не толькі шырокім колам грамадства, але і палітычнай элітай краіны, запраграмаваць яе на прыняцце памылковых рашэнняў пры распрацоўцы стратэгіі развіцця сваёй краіны і этнасу ў цэлым.

Асаблівай увагі патрабуе фарміраванне духоўнай культуры менавіта ў нацыянальнай эліты. Не сакрэт, што творчы патэнцыял і інтэлектуальны ўзровень валявых і маральных якасцей кіраўнікоў вышэйшага і сярэдняга звяна павінны быць узорнымі. Менавіта ад маральных якасцей палітычнай эліты залежыць меркаванне людзей пра ўладу. Гэтыя праблемы закранаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка на нарадзе, прысвечанай пытанням сацыяльна-прававых гарантый дзяржслужачых і павышэння прэстыжу дзяржслужбы, якая адбылася 26 ліпеня 2018 г. “Ёсць талковыя кіраўнікі – ёсць развіццё і перспектывы ў краіне. Таму да дзяржслужачых выстаўляюцца павышаныя патрабаванні. Гэта павінны быць спецыялісты, якія валодаюць шырокім кругаглядам, здольныя вызначаць стратэгічныя задачы і правільна ацэньваць вынікі прымаемых рашэнняў. Але перш за ўсё дзяржслужачы – чалавек з найвышэйшымі маральнымі якасцямі”, – падкрэсліў Прэзідэнт [1].

Вырашэнню праблем духоўна-культурнага стану грамадства ў многім садзейнічаюць фундаментальныя навуковыя напрацоўкі айчынных гуманітарыяў. Яны з’яўляюцца той тэарэтычнай асновай, якая павінна шырока выкарыстоўвацца ў працэсе арганізацыі ідэалагічнай работы і фарміравання духоўна-культурнай прасторы чалавека і ўсяго беларускага грамадства.

Падкрэслім, што шырокае распаўсюджанне навукова-тэхнічных дасягненняў стварае, у прыватнасці, ілюзію ўсё больш нарастаючай лёгкасці жыцця чалавека. Цывілізацыйнае развіццё і навука самі па сабе не змогуць забяспечыць духоўнага прагрэсу, тут неабходна вялікая ўвага да вывучэння і асэнсавання ўсяго вопыту развіцця культуры як сукупнасці адукацыі, выхавання, духоўна-маральных, інтэлектуальных і эстэтычных дасягненняў нацыі і чалавецтва. Вядома, што вывучэнне і асэнсаванае засваенне, асабліва падрастаючым пакаленнем, багацейшага нацыянальна-гістарычнага вопыту фарміравання беларускай нацыі і дзяржаўнасці – гэта надзейны падмурак, нацыянальны базіс, які дазваляе пазбегнуць дэградацыі грамадскага развіцця.

Важнае месца ў жыцці грамадства заўсёды займалі гуманітарна-грамадазнаўчыя веды. Свае вытокі гуманітарная навука бярэ ў глыбокай старажытнасці. Айчынныя гуманітарныя веды непарыўна звязаны з дзейнасцю княгіні і асветніцы Ефрасінні Полацкай, залатавуста Кірылы Тураўскага, выдатнага асветніка XVI ст., вучонага-гуманіста, беларускага першадрукара Францыска Скарыны, дарэчы, у 2017 г. беларуская грамадскаць шырока адзначала 500-годдзе нацыянальнага кнігавыдання. Толькі вучоныя Аддзялення гуманітарных наук і мастацтваў правялі звыш 70 навукова-практычных мерапрыемстваў, з якіх большаць была арганізавана ў рэгіёнах краіны [2].

Вопыт нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва яскрава сведчыць, што, нягледзячы на шматлікія цяжкасці і супярэчнасці развіцця беларускага народа, у скарбніцу сусветнай цывілізацыі ўпісаны шматлікія імёны выдатных беларускіх гуманістаў-асветнікаў: Мікалая Гусоўскага і Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага і Мялеція Сматрыцкага, Спірыдона Собаля і Афанасія Філіповіча, Сімяона Полацкага і Казіміра Лышчынскага, Георгія Каніскага і Міхаіла Казіміра Агінскага, Тэадора Нарбута і Івана Насовіча, Яна Чачота і Тамаша Зана, Восіпа Кавалеўскага і Напалеона Орды, Яўстафія Тышкевіча і Станіслава Манюшкі, Францішка Багушэвіча і Тэадора Нарбута, а таксама многіх іншых.

Дасведчаная Еўропа добра ведала не толькі імёны Францыска Скарыны, Мікалая Гусоўскага і Сымона Буднага. У адным шэрагу з імі былі і іншыя нашы славутыя землякі: Пётр Мсціславец (XVI ст.) – друкар, прыхільнік адукацыі беларускага народа, які выдаў у 1575 г. Евангелле; Яўстафій Валовіч (1520–1587) – дзяржаўны дзеяч, адзін з аўтараў Статута ВКЛ 1566 г., выступаў супраць прыняцця Люблінскай уніі; Васіль Цяпінскі (1530-я–1603) – мысліцель-гуманіст і кнігавыдавец, які апублікаваў у 1580 г. Евангелле на беларускай мове; Леў Сапега (1557–1633) – дзяржаўны дзеяч, канцлер ВКЛ, які фінансаваў выданне Статута ВКЛ 1588 г.; Спірыдон Собаль (каля 1580–1645), які выдаў адзін з першых на землях сучаснай Беларусі “Буквар”; Ілля Капіевіч (1651–1714) – асветнік, пісьменнік, стваральнік кірылічнага грамадзянскага шрыфту; Сімяон

Полацкі (1629–1680) – царкоўны дзеяч і пісьменнік, настаўнік царэвічаў Аляксея, Фёдара, царэўны Соф'і, а таксама царэвіча Пятра; Міхаіл Казімір Агінскі (1730–1800) – дзяржаўны дзеяч, кампазітар і мецэнат, а таксама многія іншыя прадстаўнікі беларускага народа, якія ўнеслі велізарны ўклад у скарбніцу нацыянальнай і сусветнай навукі і культуры [3, с. 9].

Грунтуючыся на рацыянальна-крытычным мысленні, вольным ад рэлігійнага светапогляду, гуманітарныя даследаванні пачалі інтэнсіўна развівацца ў канцы XIX стагоддзя. Значны ўклад у распаўсюджанне навуковых ідэй унеслі працы айчынных вучоных. У фундаментальных даследаваннях Ігнація Даніловіча, Мітрафана Доўнар-Запольскага, Яўхіма Карскага, Міхаіла Каяловіча, Івана Лапо, Мікалая Нікіфароўскага, Яна Насовіча, Еўдакіма Раманава, Аляксея Сапунова, Кастуся Тышкевіча, Яўстафія Тышкевіча, Яна Чачота, Паўла Шэйна, Мікалая Янчука былі ўпершыню сфармуляваны і адкрыты сусветнай навуковай супольнасці новыя, практычна не даследаваныя старонкі гісторыі матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў. Менавіта дзякуючы іх працам быў закладзены трывалы навуковы падмурак абгрунтавання беларускай нацыі і дзяржаўнасці.

Важным дасягненнем у сферы беларускай культуры XIX – пачатку XX ст. з'яўляецца адраджэнне нацыянальнай літаратуры, узнікненне беларускага прафесійнага тэатральнага мастацтва. У пачатку XX ст. актыўна пачала развівацца беларуская літаратурная мова, якая зрабіла істотны ўплыў на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці і нацыянальнай культуры беларускага народа; з'явіўся беларускі перыядычны друк. Актыўнае развіццё беларускай мовы і яе ўнармаванне пачалося з прыходам у літаратуру айчынных класікаў – Францішка Багушэвіча, Янкі Купалы, Якуба Коласа і іншых.

Вялікую ролю ў развіцці беларускага нацыянальна-культурнага руху і ў распаўсюджанні нацыянальнай асветы адыграла кнігавыдавецкае таварыства “Загляне сонца і ў наша аконца”, заснаванае Б. Эпімах-Шыпілам у Санкт-Пецярбургу ў 1906 г. Таварыства паклала пачатак сістэматычнаму выданню літаратуры на беларускай мове. Пазней адкрыліся яшчэ 6 беларускіх выдавецтваў. Толькі за 1908–1914 гг. у свет выйшлі 77 беларускіх кніг агульным тыражом 226 тысяч экзэмпляраў. У 1906–1915 гг. легальна выдавалася беларуская газета “Наша ніва”, якая стала ідэйна-арганізацыйным цэнтрам беларускага нацыянальнага руху і адыграла значную ролю ў фарміраванні і станаўленні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў [3, с. 10].

Відавочна, што нацыянальна-гуманітарныя веды за кароткі гістарычны перыяд, дзякуючы намаганням айчынных вучоных і грамадскіх дзеячаў, пачалі шырока распаўсюджвацца. Найбольш актыўна гуманітарныя навукі развіваліся ў 20-я гг. XX ст., нягледзячы на тое, што асобныя навуковыя пошукі вяліся на тэрыторыі сучаснай Беларусі і раней, у прыватнасці, у Горы-Горыцкай сельскагаспадарчай школе. Ва ўмовах ваеннай інтэрвенцыі, разрухі ўрадам краіны быў прыняты шэраг мер па ліквідацыі непісьменнасці, адкрыцці вышэйшых навучальных устаноў, а таксама стварэнні навуковых цэнтраў. Важным момантам у навуковым жыцці БССР стала адкрыццё Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, якому быў перададзены шэраг бібліятэчных фондаў Акадэміі навук, Археалагічнай камісіі, Цэнтральнай кніжнай палаты, Маскоўскага, Пецярбургскага і іншых універсітэтаў. Аднак для развіцця вытворчасці неабходна было стварэнне спецыялізаваных навуковых устаноў.

Эканоміка патрабавала навукова абгрунтаваных распрацовак, накіраваных на пераадоленне тэхніка-эканамічнай адсталасці і рашэнне рэгіянальных праблем Беларусі. З гэтай нагоды ўжо 30 студзеня 1922 г. быў заснаваны Інстытут беларускай культуры, кіраўніком якога быў прызначаны С. Некрашэвіч. Асноўнай задачай інстытута з'яўлялася вывучэнне мовы, літаратуры, гісторыі, этнаграфіі, эканомікі, прыродных багаццяў Беларусі. Навуковыя даследаванні ў Інбелкульце былі разгорнуты па гуманітарных і прыродазнаўчых навуках. З мэтай канцэнтрацыі навуковых напрамкаў былі створаны этнографа-лінгвістычная і прыродазнаўчая секцыі. Да жніўня 1925 г. у склад Інбелкульта ўваходзілі 12 пастаянных камісій: дыялекталагічная, па складанні слоўніка беларускай мовы, правапісна-тэрміналагічная, літаратурная, па вывучэнні беларускай народнай песні, гісторыка-археалагічная, па вывучэнні рэвалюцыйнага руху на Беларусі, па ахове помнікаў мастацтва і прыроды, па вывучэнні народнай гаспадаркі, па выданні твораў У. І. Леніна, па вывучэнні савецкага будаўніцтва, этнаграфічная, бібліяграфічная [4, с. 15]. У 1926 г. згодна з рашэннем Савета Народных Камісараў БССР Інстытут беларускай культуры

быў выведзены са складу Наркамата асветы і рэарганізаваны ў дзяржаўную навукова-даследчую ўстанову пры СНК БССР.

Пашырэнне асветы, актывізацыя нацыянальнага духоўна-культурнага жыцця і сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускага грамадства стваралі не толькі аб'ектыўныя ўмовы, але і патрабавалі разгортвання навуковых даследаванняў у рэспубліцы. Менавіта з гэтай нагоды Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР прымаюць 13 кастрычніка 1928 г. пастанову аб рэарганізацыі Інбелкульта ў Беларускую акадэмію навук. Урачыстае адкрыццё акадэміі адбылося 1 студзеня 1929 г. Першым прэзідэнтам Акадэміі навук быў прызначаны гісторык, прафесар У. Ігнатоўскі. Сярод акадэмікаў, яе заснавальнікаў, былі вядомыя вучоныя і дзеячы культуры Я. Лёсік, З. Жылуновіч, У. Ігнатоўскі, В. Ластоўскі, Я. Купала, Я. Колас і многія іншыя.

На дзень адкрыцця ў штаце акадэміі было толькі 128 чалавек, з іх 87 навуковых супрацоўнікаў. Акадэмія навук з самага пачатку стала вядучым навуковым цэнтрам, які актыўна ўплываў на эканамічнае, тэхналагічнае, сацыяльнае і культурнае развіццё рэспублікі. Ужо ў 1932 г. у складзе Беларускай акадэміі навук дзейнічала 12 навукова-даследчых інстытутаў. Усяго ў рэспубліцы было 40 навукова-даследчых устаноў, у якіх налічвалася каля 1,5 тыс. навуковых супрацоўнікаў, у аспірантуры навучалася 432 чалавекі.

У пачатку 1941 г. у Акадэміі навук працавала каля 750 чалавек. У яе структуры было 12 навукова-даследчых устаноў, з іх 9 інстытутаў. У гады Вялікай Айчыннай вайны многія вучоныя змагаліся з захопнікамі на фронце, у партызанскіх атрадах і падполлі. Некаторыя даследчыкі працягвалі навуковую працу ў Казані, Ташкенце, Маскве. Вялікую грамадскую і публіцыстычную дзейнасць у цяжкія гады выпрабаванняў вялі акадэмікі К. М. Міцкевіч (Якуб Колас), І. Д. Луцэвіч (Янка Купала), члены-карэспандэнты АН БССР К. К. Атраховіч (Кандрат Крапіва) і М. Ц. Лынькоў [5, с. 9].

Адразу пасля вызвалення Беларусі ў 1944 г. узнавілі сваю навуковую дзейнасць Інстытут гісторыі, Інстытут літаратуры, мовы і мастацтва, Інстытут эканомікі і Літаратурны музей Янкі Купалы.

У пасляваенны перыяд у склад Аддзялення грамадскіх навук паступова ўключаліся новыя навуковыя ўстановы, больш разнастайнай станавілася тэматыка даследаванняў. У 1947 г. быў адноўлены Інстытут філасофіі і права. У 1951 г. пастановай Прэзідыума створаны Інстытут мовазнаўства і Інстытут літаратуры і мастацтва. Па даных 1950 г., у складзе Інстытута гісторыі працавала 30 супрацоўнікаў, Інстытута эканомікі – 21 супрацоўнік, Інстытута літаратуры і мовы – 31 супрацоўнік, Інстытута філасофіі і права – 13 супрацоўнікаў, Літаратурнага музея Янкі Купалы – 4 супрацоўнікі.

У 1957 г. была вызначана структура ўстаноў культуралагічнага профілю. Пастановай Савета Міністраў БССР № 340 ад 11 чэрвеня 1957 г. былі створаны асобныя інстытуты: Інстытут літаратуры (з ліпеня таго ж года – імя Янкі Купалы) і Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Інстытуту мовазнаўства з 1956 г. прысвоена імя Якуба Коласа. Адпаведна, у 1957 г. у складзе Аддзялення з'явіўся Музей Якуба Коласа. Агульная колькасць супрацоўнікаў ва ўсіх установах Аддзялення на канец 1960 г. налічвала ўжо 413 чалавек (з іх навуковага персаналу 341 чалавек, 9 дактароў, 129 кандыдатаў навук) [6].

У гэты час калектыў Інстытута гісторыі пачаў працу па падрыхтоўцы выдання "Гісторыя Беларусі". У Інстытуце эканомікі распрацоўваліся праблемы, звязаныя з павышэннем прадукцыйнасці працы і эканамічнай эфектыўнасці беларускай прамысловасці. Асноўная ўвага Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы была засяроджана на стварэнні двухтомнай "Гісторыі беларускай савецкай літаратуры", выданні класікаў беларускай літаратуры і старажытных тэкстаў. Інстытут мовазнаўства здолеў ажыццявіць грунтоўную працу па забеспячэнні філалагічных факультэтаў ВНУ рэспублікі вучэбнымі дапаможнікамі. Перспектыўным напрамкам дзейнасці лінгвістаў у пачатку 1960-х гг. сталі даследаванні славістычнага профілю. Аддзелам прававых навук у пачатку 1960-х гг. праводзілася распрацоўка праектаў Грамадзянскага і грамадзянска-працэсуальнага кодэксаў БССР [7].

Дасягненні ўстаноў Аддзялення грамадскіх навук былі прызнаны на саюзным узроўні – у 1977 г. выданні інстытутаў філасофіі і права, гісторыі, мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, літаратуры былі ўзнагароджаны бронзавым медалём ВДНГ СССР.

У пачатку 1980-х гг. ва ўстановах Аддзялення працавала ўжо 640 навуковых супрацоўнікаў, сярод іх – 52 дактары і 262 кандыдаты навук, праходзіла падрыхтоўку больш за 200 аспірантаў і больш за 150 саіскальнікаў вучонай ступені [8].

Станаўленне незалежнай Рэспублікі Беларусь патрабавала развіцця новых навуковых напрамкаў. У гэты перыяд чарговы раз вучоным-гуманітарыям прыйшлося пераглядаць свае погляды на працэсы развіцця грамадства, якія калісьці былі прызнаны адзіна правільнымі пад уплывам аўтарытэту асобных дзяржаўных і навуковых дзеячаў. Персанальны склад Аддзялення ў 1992 г. налічваў 8 акадэмікаў, 27 членаў-карэспандэнтаў. Ва ўстановах Аддзялення працавала 512 навуковых супрацоўнікаў, сярод іх – 72 дактары і 274 кандыдаты навук. З 1990 г. у структуры Аддзялення быў створаны Інстытут сацыялогіі [9].

Аддзяленне грамадскіх навук Акадэміі навук БССР у 1995 г. было пераўтворана ў Аддзяленне гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі [10]. Даследаванні праводзіліся ў межах пяці навуковых праграм: “Гісторыя станаўлення і развіцця беларускай народнасці і нацыі. Нацыянальныя працэсы і міжнацыянальныя адносіны на сучасным этапе”, “Суверэнітэт Рэспублікі Беларусь – эканамічны, прававы і сацыялагічны аспекты”, “Культура беларускага народа: актуальныя праблемы сучаснага развіцця і гістарычны вопыт”, “Беларуская мова і літаратура: гісторыя і сучаснасць”, “Чалавек, культура, навука: праблемы гуманізацыі сацыяльна-палітычных і маральна-прававых адносін”. Працягвалася далейшая рэарганізацыя Аддзялення.

У цяперашні час у склад Аддзялення ўваходзіць пяць дзяржаўных навуковых устаноў: Інстытут гісторыі, Інстытут філасофіі, Інстытут эканомікі, Інстытут сацыялогіі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, які аб’ядноўвае тры філіялы: “Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы”, “Інстытут мовазнаўства імя Якуба Коласа”, “Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы”. У склад Аддзялення таксама ўваходзяць Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа, выдавецкі дом “Беларуская навука” і Інстытут падрыхтоўкі навуковых кадраў НАН Беларусі.

У 2018 г. Аддзяленне аб’ядноўвае 9 акадэмікаў і 14 членаў-карэспандэнтаў. Ва ўстановах Аддзялення працуе 927 чалавек, з іх 543 даследчыкі, сярод якіх 57 дактароў і 199 кандыдатаў навук.

Як сведчыць вопыт, сёння сусветная навуковая супольнасць канцэнтруе намаганні на каардынацыі дзейнасці розных напрамкаў для вырашэння буйных навуковых задач. З мэтай каардынацыі навуковай дзейнасці па ініцыятыве Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў на базе навуковых устаноў Аддзялення створана сістэма кластараў, якая ўключае вядучую рэспубліканскую эканамічную школу, рэспубліканскі навуковы цэнтр сацыялагічнага маніторынгу, міжнародную школу гісторыка-археалагічных даследаванняў, рэспубліканскі цэнтр фундаментальнай і практычнай філасофіі, міжнародны цэнтр беларускай культуры, міжнародную школу беларускай мовы і літаратуры, а таксама рэспубліканскую лабараторыю гісторыка-культурнай спадчыны [11].

За гады незалежнасці нашай краіны вучоныя-гуманітарыі значна актывізавалі навуковыя даследаванні, якія садзейнічаюць умацаванню беларускай дзяржаўнасці. У 2011–2017 гг. установамі Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі атрыманы шэраг арыгінальных навуковых вынікаў, якія запатрабаваны беларускім грамадствам. Даследаванні гуманітарыяў, безумоўна, будуць садзейнічаць удасканаленню беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця, забеспячэнню якасці адукацыі і кадравага навуковага патэнцыялу, захаванню гісторыка-культурнай спадчыны, умацаванню нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

Менавіта гэтым мэтам служыць прынятая ў 2016 г. дзяржаўная праграма навуковых даследаванняў “Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства” на 2016–2020 гг., якая дазволіла аб’яднаць намаганні акадэмічных вучоных і даследчыкаў з вышэйшых навучальных устаноў краіны і, што вельмі важна, уключыць у сферу гуманітарных даследаванняў студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў.

Некаторыя колькасныя паказчыкі выканання дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў, якія выконваліся гуманітарыямі ў 2011–2017 гг., прыведзены ніжэй (мал. 1–3).

За апошнія пяць гадоў праведзена значная даследчая праца. Так, у *Цэнтры даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры* завершаны цыкл работ «Навуковае і практычнае забес-




Мал. 1. Колькасць кніжных выданняў, падрыхтаваных за перыяд 2011–2017 гг. выканання дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў "Гісторыя і культура" і "Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства"
Fig. 1. Number of book editions prepared during the execution of national program of scientific studies in 2011–2017 called "History and culture" and "Economy and humanitarian development of the Belarusian society"




Мал. 2. Колькасць навуковых артыкулаў, дакладаў і тэзісаў дакладаў, падрыхтаваных за перыяд 2011–2017 гг. выканання дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў "Гісторыя і культура" і "Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства"
Fig. 2. Number of scientific articles, reports and theses of the reports prepared during the execution of national programs of scientific studies in 2011–2017 called "History and culture" and "Economy and humanitarian development of the Belarusian society"




Мал. 3. Колькасць выканаўцаў дзяржаўных праграм навуковых даследаванняў "Гісторыя і культура" і "Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства" за перыяд 2011–2017 гг.
Fig. 3. Number of performers of national programs of scientific studies in 2011–2017 called "History and culture" and "Economy and humanitarian development of the Belarusian society"

пячэнне ўвядзення ў дзеянне Закона Рэспублікі Беларусь "Аб правілах беларускай арфаграфіі і пунктуацыі"», які ўключае комплекс узаемазвязаных падручнікаў, даведнікаў і слоўнікаў; падрыхтаваны і выдадзены зборы твораў Якуба Коласа ў 20 тамах, І. П. Шамякіна ў 23 тамах, І. Навуменкі ў 10 тамах [12–14], 13 тамоў 50-томнай серыі "Залатая калекцыя беларускай літаратуры".

У 2017 г. завершана ўнікальнае выданне фундаментальнага "Гістарычнага слоўніка беларускай мовы" ў 37 выпусках [15]. Гэта першы і адзіны ў айчыннай гуманітарнай навуцы даведнік, які з максімальнай паўнатой адлюстроўвае багацце слоўнікавага фонду беларускай мовы XIV–XVIII стст., з'яўляецца надзейнай крыніцай пазнання мінулага Беларусі, дае змястоўную інфармацыю пра сацыяльна-эканамічнае жыццё, матэрыяльную і духоўную культуру беларускага народа ў названы перыяд.

Падрыхтавана фундаментальнае навуковае 6-томнае выданне "Традыцыйная мастацкая культура беларусаў" [16], за яго стварэнне А. М. Боганевай, Т. Б. Варфаламеевай прысуджана спецыяльная прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2014 года (у складзе аўтарскага калектыву) [17]; завершана выданне шматтомнай працы "Нарысы гісторыі культуры Беларусі" ў 4 тамах [18].

Упершыню падрыхтавана і выдадзена праца, якая мае важнае значэнне для развіцця турызму ў нашай краіне "Tourist mosaic of Belarus" (на рускай і англійскай мовах) [19]; працягваецца падрыхтоўка серыі энцыклапедычных выданняў "Гарады і вёскі Беларусі" (15 кніг 10 тамоў, 2005–2017), якая мае важнае значэнне для інфармацыйнага забеспячэння працы выканаўчых органаў улады рэгіянальнага і мясцовага ўзроўню, для арганізацыі сістэмы патрыятычнага выхавання, турыстычнай дзейнасці.

У *Інстытуце гісторыі* падрыхтавана і выдадзена ўнікальная двухтомная калектыўная манаграфія "Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст." [20], дзе ўпершыню прааналізаваны перадумовы фарміравання нацыянальна-дзяржаўнай ідэі беларускага народа, паказаны працэс афармлення беларускай дзяржаўнасці; праведзена першае комплекснае даследаванне гісторыі Полацка IX–XVIII стст. [21] і Навагрудка [22].

Упершыню ў гісторыі археалагічнай навукі комплексна даследаваны ўнікальныя помнікі археалогіі – гарадзішча Обчын Любанскага раёна, старажытнае славянскае паселішча X–XII стст. у в. Васілеўшчына Дзяржынскага раёна на плошчы звыш 20 тыс. м², комплекс эпохі вікінгаў VIII–X стст. каля населенага пункта Кардон Шумілінскага раёна Віцебскай вобласці, адкрыццё якога пацвярджае існаванне шырокіх міжнародных сувязей дадзенага рэгіёна Беларусі і яго вядучую ролю ў фарміраванні Дняпроўска-Ловацкага адрэзка шляху "з варагаў у грэкі" на ранняй стадыі ўтварэння дзяржаўных структур ва ўсходніх славян (IX ст. – сярэдзіна X ст.).

Вучоныя *Інстытута эканомікі* распрацавалі Нацыянальную праграму развіцця экспарту Рэспублікі Беларусь на 2011–2015 гг. (сумесна з Міністэрствам замежных спраў) [23]; канцэпцыю комплекснага прагнозу навукова-тэхнічнага прагрэсу і прыярытэтных напрамкаў навукова-тэхнічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь на перыяд да 2020 г. [24]; навуковы прагноз эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь да 2030 г., у якім абгрунтаваны найважнейшыя прыярытэты трансфармацыі нацыянальнай эканомікі і яе інтэграцыі ў сусветную эканамічную сістэму на доўгатэрміновую перспектыву; а таксама канцэпцыю развіцця гарадоў-спадарожнікаў Мінска.

У *Інстытуце філасофіі* ўпершыню ў міжнароднай гуманітарыстыцы ажыццёўлена сістэмная рэканструкцыя гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі. У межах даследавання апублікаваны першыя 4 тамы шасцітомнай "Гісторыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі" [25]. На аснове даследавання спадчыны вядучых мысліцеляў XX–XXI стст. у галіне тэорыі глабальнага развіцця (М. Маклюэна, Д. Бэла, І. Валерстайна, Ё. Шумпетэра, Ю. Хабермаса, В. Сцёпіна, С. Глазьева) абгрунтавана некласічная версія станаўлення ў Беларусі грамадства, заснаванага на ведах. Праведзенае даследаванне неабходна для разумення стратэгіі і асаблівасцей мадэрнізацыі беларускай эканомікі і грамадства ва ўмовах спалучэння элементаў традыцыйнага светапогляду і культуры, каштоўнасцей індустрыялізму (спадчыны савецкай грамадскай сістэмы) і новых мадэлей мыслення, паводзін і дзейнасці, якія сфарміраваліся пад уплывам сеткі глабальных камунікацый, галіны інфармацыйнай вытворчасці і паслуг. Распрацоўка

дазваляе прааналізаваць патэнцыял, цяжкасці і рызыкі ўкаранення асобных аспектаў новай эканамічнай мадэлі, вызначыць перспектыўныя напрамкі і “пункты росту” ў інфармацыйнай мадэрнізацыі грамадства.

Вучоныя *Інстытута сацыялогіі* распрацавалі методыку вывучэння асаблівасцей сацыякультурнага развіцця сельскіх рэгіёнаў, якая дазволіла выявіць спецыфіку і скласці сацыяльнакультурныя партрэты сельскіх рэгіёнаў усіх абласцей Беларусі.

Значная колькасць навуковых прац айчынных вучоных-гуманітарыяў, апублікаваных у 2015–2018 гг., выклікала шырокі грамадскі рэзананс, спрыяла павышэнню эфектыўнасці нацыянальнай эканомікі. Сярод такіх выданняў неабходна назваць кнігі “Беларусь: старонкі гісторыі” на кітайскай і англійскай мовах [26; 27]; фундаментальнае аналітычна-дакументальнае выданне “Страна в огне” [28], якое было падрыхтавана сумесна з расійскімі і ўкраінскімі вучонымі ў 2017 г. Дадзеная фундаментальная праца была прызнана лепшай кнігай года ў Расійскай Федэрацыі ў намінацыі “Гісторыя”.

Патрэбна назваць “Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы” [29], у якім змешчана 65 тысяч слоў, прычым больш за 30 % матэрыялаў гэтага фундаментальнага выдання абноўлена ў параўнанні з папярэднімі аналагамі, і многія іншыя выданні.

Навуковыя супрацоўнікі ўстаноў Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў рэгулярна прызнаюцца лаўрэатамі прэстыжных конкурсаў, атрымліваюць высокія дзяржаўныя ўзнагароды. Так, па выніках 2017 г. за распрацоўку метадалогіі канвертавання электроннага арфаграфічнага запісу беларускіх слоў у транскрыпцыю і стварэнне першага поўнага беларускага лінгвістычнага даведніка пераможцамі конкурсу “ТОП-10” вынікаў дзейнасці вучоных НАН Беларусі ў галіне фундаментальных і прыкладных даследаванняў сталі загадчык аддзела Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі В. П. Русак; навуковы супрацоўнік названай установы В. А. Мандзік; загадчык лабараторыі Аб’яднанага інстытута праблем інфарматыкі НАН Беларусі Ю. С. Гецэвіч і аспірант гэтай навуковай установы С. І. Лысы.

Пераможцамі конкурсу “ТОП-10” у гэтым жа годзе сталі навуковыя супрацоўнікі Інстытута гісторыі НАН Беларусі Г. М. Бяліцкая, Э. А. Ляшкевіч і А. Ф. Касюк за адкрыццё ў Палессі ўнікальных для айчыннай і сусветнай гістарычнай навукі славянскіх паселішчаў, а таксама раскрыццё працэсу фарміравання і развіцця раннеславянскай супольнасці на тэрыторыі Беларусі.

Важна падкрэсліць, што нацыянальная спадчына – гэта не толькі надзейны падмурак для паспяховага развіцця грамадства, але і своеасаблівы гарант ад наступстваў разбэшчанасці і заняпаду духоўна-культурнай сферы, трывалая ахова новых пакаленняў ад здрады нацыянальным традыцыям і каштоўнасцям.

Агульнавядома, што нацыя, якая страчвае альбо здраджвае назапашаным за стагоддзі духоўным асновам, становіцца безабароннай перад выклікамі часу і адкрытай да ўспрымання чужых ідэй і памкненняў, губляецца ў лабірынце гістарычнага шляху.

Каб не страціць нацыянальную адметнасць, захаваць сучаснае і будучае, важна не толькі вывучаць мінулы вопыт, але і пастаянна суадносіць яго з навакольным светам, што дазваляе своечасова ўсведамляць і прагназаваць перспектывы грамадскага развіцця нашай дзяржавы ў неадназначных выкліках глабалізацыі. З гэтай нагоды вучоныя Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў праводзяць не толькі вялікую навукова-даследчую працу, але і мэтанакіраваную грамадска-асветніцкую дзейнасць, папулярызуючы дасягненні айчыннай навукі. Напрыклад, толькі ў 2017 г. было арганізавана 85 навукова-практычных мерапрыемстваў, зроблена звыш 300 выступленняў у сродках масавай інфармацыі. Станоўчым прыкладам нашай дзейнасці з’яўляецца наладжванне сувязей з кіраўніцтвам многіх рэгіёнаў краіны. Устаноўлена цеснае супрацоўніцтва з адміністрацыямі Мінска, Пінска, Оршы, Полацка, Брэста, Ашмянскага, Навагрудскага, Капыльскага, Карэліцкага, Камянецкага, Нясвіжскага, Слуцкага, Смаргонскага і іншых раёнаў. Пры актыўным удзеле мясцовых краязнаўцаў, настаўнікаў і школьнай моладзі вучоныя арганізуюць сумесныя навуковыя канферэнцыі, круглыя сталы, археалагічныя даследаванні, моўныя і фальклорна-этнаграфічныя экспедыцыі.

Сярод найбольш значных навуковых мерапрыемстваў, якія адбыліся за апошнія пяць гадоў, неабходна назваць XV Міжнародны з’езд славістаў (20–27 жніўня 2013 г.); міжнародныя наву-

ковыя канферэнцыі "Першая сусветная вайна ў народнай памяці і мастацкім адлюстраванні" (7–8 кастрычніка 2014 г.) і "Гэты дзень мы набліжалі, як маглі… (да 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне і заканчэння Другой сусветнай вайны)" (7–8 мая 2015 г.); Першы міжнародны навуковы кангрэс беларускай культуры (5–6 мая 2016 г.); Першы беларускі філасофскі кангрэс "Нацынальная філасофія ў глабальным свеце" (18–20 кастрычніка 2017 г.). Акрамя таго, вучоныя-гуманітарыі прымалі актыўны ўдзел у правядзенні I і II з'ездаў вучоных Рэспублікі Беларусь.

Значным укладам у папулярызацыю гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народа, каштоўная частка якой – друкаванае слова, а таксама ў развіццё нацыянальнай самасвядомасці беларусаў з'яўляецца штогадовае правядзенне ў розных гарадах і мястэчках нашай Бацькаўшчыны Дня беларускага пісьменства. У арганізацыі гэтага важнага грамадска-культурнага мерапрыемства непасрэдны ўдзел прымаюць вучоныя Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў. У гэтым годзе святочныя мерапрыемствы адбыліся ў г. Іванава Брэсцкай вобласці.

Важным напрамкам навуковай дзейнасці з'яўляецца ўмацаванне міжнародных навуковых сувязей. Прыкметны імпульс атрымала навуковае супрацоўніцтва арганізацый Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі з навуковымі цэнтрамі Расіі, Украіны, Літвы, Эстоніі. Вялікая ўвага надаецца даследаванню памежных тэрыторый.

За апошнія пяць гадоў актыўна развіваліся ўзаемаадносіны вучоных-гуманітарыяў Беларусі і Кітая. Па ўзаемнай дамоўленасці ў Інстытуце філасофіі створаны Беларуска-кітайскі філасофска-культурны даследчы цэнтр, у Інстытуце эканомікі – Беларуска-кітайскі аналітычны цэнтр развіцця. Штогод установы Аддзялення наведваюць шматлікія дэлегацыі кітайскіх калег, праводзяцца сумесныя навукова-практычныя мерапрыемствы і буйныя навуковыя даследаванні. Напрыклад, у 2017 г. толькі Інстытут эканомікі НАН Беларусі наведалі 13 дэлегацый з КНР у колькасці звыш 80 чалавек. Заключаны дагаворы аб супрацоўніцтве з Інстытутам Расіі, Усходняй Еўропы і Цэнтральнай Азіі.

Развіваецца навуковае супрацоўніцтва з шэрагам навуковых школ краін Еўропы. У гарадах Польшчы і Францыі прайшоў шэраг выстаў, на якіх былі прадстаўлены беларускія абразы і званы XVIII–XIX стст., беларускія касцюмы і традыцыйныя ручнікі з калекцый Музея старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі.

Штогод вучоныя Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі рыхтуюць аналітычныя даклады па праблемах сацыяльна-эканамічнага і духоўна-культурнага развіцця краіны, праводзяць сацыялагічныя апытанні, арганізуюць круглыя сталы сумесна з рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, грамадскімі аб'яднаннямі і сродкамі масавай інфармацыі ў многіх гарадах і раёнах Беларусі.

Акадэмічныя вучоныя-гуманітарыі, нягледзячы на значныя дасягненні, плануюць і ў далейшым развіваць ідэі канструктыўнага дыялогу, навукова абгрунтаваных высноў на працэсы грамадскага развіцця, працягваць вялікую працу па захаванні духоўна-культурнай спадчыны, пашырэнні беларускамоўнай прасторы, умацаванні светапогляду і гістарычнай свядомасці беларускага народа.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Нарада па пытаннях сацыяльна-прававых гарантый дзяржслужачых і павышэння прэстыжу дзяржслужбы [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://president.gov.by/by/news_by/view/narada-pa-pytannjax-satsyjalna-pravavyx-garantyj-dzjarzhsluzhachyx-i-pavyshennja-prestyzhu-dzjarzhsluzhby-19195/. – Дата доступу: 26.07.2018.

2. План работы Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі на 2017 г. // Бягучы архіў Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі.

3. Аддзяленне гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі: (да 75-годдзя з дня заснавання) / Нац. акад. навук Беларусі; рэдсавет: А. А. Каваленя (старш.) [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2011. – 321 с.

4. Інстытут беларускай культуры / М. П. Касцюк [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 255 с.

5. Национальная академия наук Беларуси: энциклопедический справочник / Нац. акад. наук Беларуси; редкол.: В. Г. Гусаков (гл. ред.) [и др.]. – Минск: Беларус. навука, 2017. – 599 с.

6. Центральный научный архив НАН Беларуси. – Фонд 1. Оп. 1. Д. 793. С. 5.

7. Центральный научный архив НАН Беларуси. – Фонд 1. Оп. 1. Д. 1115. С. 88.

8. Центральный научный архив НАН Беларуси. – Фонд 1. Оп. 1. Д. 72. С. 91, 100.
9. Центральный научный архив НАН Беларуси. – Фонд 1. Оп. 1. Д. 81. С. 68.
10. Центральный научный архив НАН Беларуси. – Фонд 1. Оп. 1. Д. 3332. С. 9, 13.
11. Центральный научный архив НАН Беларуси. – Фонд 1. Оп. 1. Д. 5172. С. 78.
12. Колас, Я. Збор твораў: у 20 т. / Я. Колас; Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ.; рэдкал.: М. У. Мясніковіч [і інш.], прадмова М. Мушынскага. – Мінск: Беларус. навука, 2007–2012.
13. Шамякін, І. Збор твораў: у 23 т. / І. Шамякін; Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ.; рэдкал.: У. В. Гніламедаў [і інш.], прадмова У. В. Гніламедава. – Мінск: Маст. літ., 2010–2014.
14. Навуменка, І. Збор твораў: у 10 т. / І. Навуменка; Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ.; прадмова П. Навуменкі, пасляслоўе С. Лаўшука. – Мінск: Маст. літ., 2012–2017.
15. Гістарычны слоўнік беларускай мовы / пад рэд. А. М. Булыкі, А. І. Жураўскага. – Мінск: Беларус. навука, 1982–2017. – Вып. 1–37.
16. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / ідэя і агульнае рэдагаванне: Т. Б. Варфаламеева. – Мінск: Вышэйш. школа, 2001–2013.
17. Аб прысуджэнні спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва 2014 года [Электронный ресурс]: Указ Прэзідэнта Рэсп. Беларусь, 30 снежня 2014 г., № 650 // Президент Республики Беларусь. – Режим доступа: http://president.gov.by/ru/official_documents_ru/view/ukaz-650-ad-30-snezhnja-2014-g-10571/
18. Нарысы гісторыі культуры Беларусі: у 4 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр даслед. беларус. культуры, мовы і літ.; рэдкал.: А. І. Лакотка [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2013–2017.
19. Tourist mosaic of Belarus / A. I. Lokotko [et al.]. – Minsk: Belaruskaya navuka Publ., 2013. – 624 p.
20. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2011. – 584 с.
21. Полоцк / О. Н. Левко [и др.]; редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.); науч. ред. О. Н. Левко; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск: Беларус. навука, 2012. – 743 с. – (Древнейшие города Беларуси).
22. Гісторыя Навагрудка – з глыбінь вякоў да нашых дзён = История Новогрудка – из глубин веков до наших дней / М. П. Касцюк [і інш.]; рэдкал.: М. П. Касцюк (гал. рэд.). – Мінск: Белстан, 2014. – 592 с.
23. О Национальной программе развития экспорта Республики Беларусь на 2011 – 2015 годы [Электроный ресурс]: постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 23 мая 2011 г., № 656 // Совет Министров Республики Беларусь. – Режим доступа: http://www.government.by/upload/docs/file55595f0025b31200.PDF. – Дата доступа: 26.07.2018.
24. Беларусь 2020: наука и экономика: концепция комплексного прогноза научно-технического прогресса и приоритетных направлений научно-технической деятельности в Республике Беларусь на период до 2020 года / В. Г. Гусаков [и др.]; под ред. В. Г. Гусакова. – Минск: Беларус. навука, 2015. – 211 с.
25. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі: у 6 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т філасофіі; рэдкал.: В. Б. Евароўскі [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2008–2017. – 4 т.
26. Беларусь: страницы истории / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории; редсовет А. А. Коваленя [и др.]. – Social sciences academic press (China), 2016. – 380 с. (на китайском языке).
27. Belarus: Pages of History / National Academy of Sciencies of Belarus, Institute of History; editorial board A. A. Kovalenya (head) [et al.]. – Minsk: Belaruskaya navuka Publ., 2018. – 406 p.
28. Страна в огне: в 3 т. / Рос. акад. наук, Ин-т всеобщей истории; Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – М.: Просвещение: Абрис, 2011–2017.
29. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / уклад.: І. Л. Капылоў [і інш.]; пад рэд. І. Л. Капылова. – Мінск: Беларус. Энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2016. – 968 с.

## References

1. *Meeting on the issues of social and legal guarantees of civil servants and enhancing the prestige of the civil service.* Available at:http://president.gov.by/by/news_by/view/narada-pa-pytannjax-satsyjalna-pravavyx-garantyj-dzjarzhsluzhachyx-i-pavyshennja-prestyzhu-dzjarzhsluzhby-19195/. accessed 26 July 2018 (in Belarusian).
2. Work plan of the Department of Humanitarian Sciences and Arts of the National Academy of Sciences of Belarus for 2017. *Current archive of the Department of the Humanities and Arts of the National Academy of Sciences of Belarus.*
3. Kavalenya A. A. (ed.) *Department of Humanitarian Sciences and Arts of the National Academy of Sciences of Belarus (To the 75$^{th}$ anniversary of the foundation).* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2011. 321 p. (in Belarusian).
4. Kostyuk M. P. *Institute of the Belarusian culture.* Minsk, Navuka i tekhnika Publ., 1993. 255 p. (in Belarusian).
5. Gusakov V. G. (ed.) *National Academy of Sciences of Belarus.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2017. 599 p. (in Russian).
6. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus.* F. 1. Op. 1. D. 793. S. 5. (in Russian).
7. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus.* F. 1. Op. 1. D. 1115. S. 88 (in Russian).
8. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus.* F. 1. Op. 1. D. 72. S. 91, 100 (in Russian).
9. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus.* F. 1. Op. 1. D. 81. S. 68 (in Russian).
10. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus.* F. 1. Op. 1. D. 3332. S. 9. 13 (in Russian).
11. *Central Scientific Archive of the National Academy of Sciences of Belarus.* F. 1. Op. 1. D. 5172. S. 78 (in Russian).
12. Kolas Ya. *Collected Works in 20 vol.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2007–2012 (in Belarusian).
13. Schamyakin I. *Collected Works in 23 vol.* Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 2010–2014 (in Belarusian).

14. Navumenka I. Ya. *Collected works in 10 vol.* Minsk, Mastatskaya litaratura Publ., 2012–2017 (in Belarusian).

15. Budz'ko I. U., Bulyka A. M., Kramko I. I., Myasnikova V. U., Fedarenka G. U., Yarmolenka E. V. *Historical Dictionary of the Belarusian language. Vol. 1–37.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 1982–2017 (in Belarusian).

16. Bas′ko V. I., Valodzina T. V., Varfalameeva T. B., Kozenka M. A., Kukharonak T. I., Smirnova I. Yu., Tsitoў V. S. *Traditional Art Culture of Belarusians in 6 vol.* Minsk, Vysheishaya shkola Publ., 2001–2013 (in Belarusian).

17. On awarding the special award of the President of the Republic of Belarus to the figures of culture and art of 2014: Decree of the President of the Republic of Belarus of December 30, 2014, no. 650. *President of the Republic of Belarus.* Available at: http://president.gov.by/ru/official_documents_ru/view/ukaz-650-ad-30-snezhnja-2014-g-10571 (in Belarusian).

18. Lakotka A. I., Shamruk A. S., Gabrus' T. V., Zhuk V. I., Sakhuta Ya. M., Agafonava N. A., Kastsyukovich M. G., Myadzvedzeva V. A., Karpilava A. A., Belaokaya M. A., Sushko K. A., Marunoў A. A., Yuўchanka N. A., Mdyvani T. G., Tsmyg G. P., Prakaptsova V. P., Smol'ski R. B., Yarmalinskaya V. M., Valodzina T. V., Kukharonak T. I., Kalachova I. I., Yashchanka A. R., Balunenka I. I. *Studies in the History and Culture of Belarus in vol. 4.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2013–2017 (in Belarusian).

19. Lakotka A. I., Knyazeva, V. M., Marozaў Ya. V., Izotava V. V., Burkov A. V. *Tourist mosaic of Belarus*. Minsk: Belaruskaya navuka Publ., 2013. 624 p.

20. Kavalenya A. A., Smyakhovich M. U., Kastsyuk M. P., Danilovich V. V., Zhylinski M. G., Zabaўski M. M., Nestsyarovich M. B., Filatava A. M., Golubeў V. F., Yanoўski, A. A., Yarmusik, E. S. (2011). *History of the Belarusian Statehood in the Late 18th and Early 19th Centuries.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ. 2011. 584 p. (in Belarusian).

21. Levko O. N., Shtykhov G. V., Gabrus' T. V., Duk D. V., Tarasov S. V., Grusha A. I., Bektineev Sh. I., Voronin V. A., Skep'yan A. A., Matsuk A. V., Klimov M. V., Voitekhovich A. V., Emel'yanchik O. A., Solov'ev A. A., Magalinskii I. V., Cherevko V. V. Kovalenya A. A., Zagorul'skii E. M., Lysenko P. F., Makushnikov O. A., Marzalyuk I. A., Medvedev A. M. *Polotsk. The most ancient cities of Belarus.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ. 2012. 743 p. (in Russian).

22. Kostyuk M. P. (et al.) *History of Novogrudok: from the depths of the centuries to the present day.* Minsk, Belstan Publ, 2014. 592 p. (in Belarusian).

23. On the National Export Development Program of the Republic of Belarus for 2011–2015. Resolution of the Council of Ministers of the Republic of Belarus of May 23, 2011, no. 656. *Council of Ministers of the Republic of Belarus.* Available at: http://www.government.by/upload/docs/file55595f0025b31200.PDF (accessed 26 juli 2018) (in Russian).

24. Gusakov V. G., Daineko A. E., Dedkov S. M., Goncharov V. V. Griboedova I. A. *Belarus 2020: Science and Economy: A Concept for Integrated Forecating of Scientific and Technical Progress and PriorityAreas for Scientific and Technical Activity in the Republic of Belarus up to 2020.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2015. 211 p. (in Russian).

25. Babkou I. M., Evarouski V. B., Darashevich E. K., Konan U. M., Dubrouski U. V., Tsukerman A. Ya., Kul'-Syal'verstava S. Ya., Ramanchanka Ya. V., Lazarevich A. A., San'ko S. I., Shyrakanau Dz. I. *History of philosophical and political thought of Belarus in vol. 6.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2008–2017 (in Belarusian).

26. Kovalenya A. A. (et al.) *Belarus: pages of history.* Social sciences academic press (China), 2016. 380 p. (in China).

27. Kovalenya A. A. (ed.) *Belarus: Pages of History.* Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 2018. 406 p.

28. Russian Academy Sciences, Institute of General History, National Academy of Sciences of Belarus, Institute of History. *Country on fire in 3 vol.* Moscow, Prosveshchenie: Abris Publ., 2011–2017 (in Russian).

29. Kopylov I. L. (ed.) *Explanatory dictionary of the Belarusian literary language.* Minsk, Belarusian Encyclopedia named after Petrusia Brovka, 2016. 968 p. (in Belarusian).

## Информация об авторах

**Коваленя Александр Александрович** – член-корреспондент, доктор исторических наук, профессор, академик-секретарь Отделения гуманитарных наук и искусств. Национальная академия наук Беларуси (пр. Независимости, 66, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: nasb@presidium.bas-net.by.

**Левкович Василий Иванович** – кандидат философских наук, заместитель академика-секретаря Отделения гуманитарных наук и искусств. Национальная академия наук Беларуси (пр. Независимости, 66, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: nasb@presidium.bas-net.by.

**Юшкевич Ольга Сергеевна** – кандидат филологических наук, ученый секретарь Отделения гуманитарных наук и искусств. Национальная академия наук Беларуси (пр. Независимости, 66, 220072, Минск, Республика Беларусь). E-mail: okuh@mail.ru

## Information about the authors

**Aleksandr A. Kovalenya** – Corresponding Member, D. Sc. (Hist.), Professor, Academic Secretary, Humanities and Fine Arts Division of the National Academy of Sciences of Belarus (66 Nezavisimosti Ave., Minsk 220072, Belarus). E-mail: nasb@presidium.bas-net.by

**Vasili I. Levkovich** – Ph. D. (Philos.), Deputy Academic Secretary, Humanities and Fine Arts Division of the National Academy of Sciences of Belarus (66 Nezavisimosti Ave., Minsk 220072, Belarus). E-mail: nasb@presidium.bas-net.by

**Olga S. Yuschkevich** – Ph. D. (Philol.), Scientific Secretary, Humanities and Fine Arts Division of the National Academy of Sciences of Belarus (66 Nezavisimosti Ave., Minsk 220072, Belarus). E-mail: okuh@mail.ru